Без речевого общения невозможно полноценное развитие ребёнка. Речь включает в себя несколько составляющих сторон: фонематическую (звуковая культура), лексическую, грамматический строй, связную речь. Своевременное развитие речи ребенка помогает ему приобретать и усваивать новые знания, расширять словарный запас, развивать представления об окружающем его мире, т. к. речь очень тесно связана с нашим мышлением.

После того как ребенок овладевает речью, окружающий мир для него удваивается. Таким образом, слово удваивает мир и позволяет ребенку мысленно оперировать предметами даже в их отсутствие. Это расширяет границы его познавательной деятельности: он может пользоваться опосредованными средствами расширения своего кругозора (художественное произведение, рассказ взрослого, объяснение). Таким образом, развивая речь ребенка педагог должен учитывать его возрастные особенности и применять современные педагогические технологии для наиболее эффективного решения данной задачи.

**Список использованных источников:**

1. Байханов, И. Б Возрастная психология: учеб. пособие / И. Б. Байханов, А. В. Ажиев, И. Гадаборшева. – Махачкала : Общество с ограниченной ответственностью «АЛЕФ», 2020. – 270 с.

2. Ворошнина, Л. В. Развитие речи и общения детей дошкольного возраста в 2 ч. Часть 1. Младшая и средняя группы : практическое пособие для вузов / Л. В. Ворошнина. – 2-е изд. – М. : Издательство Юрайт, 2022. – 217 с.

3. Психолингвистика развития [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://studopedia.net/4_37261_glava--psiholingvistika-razvitiya.html. – Дата доступа: 20.07.2022

4. Тихеева, Е. И. Развитие речи детей / Е. И. Тихеева. – М. : Издательство «Юрайт», 2022. – 161 с.

5. Немов, Р. С. Кн. 3: Психодиагностика. Введение в научное психологическое исследование с элементами математической статистики : учеб. для студ. высш. пед. учеб. заведений / Р. С. Немов. – 4-е изд. – М. : Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2001. – 640 с.

## ВУЧУ СЯбе: РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ ПА-НОВАМУ

*Галубовіч Н. М.,*
*ПУА «Мінская міжнародная гімназія»*
*Ясенева Д. У.,*
*ДУА «Сярэдняя школа № 59 г.Мінска»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** У дадзеным артыкуле прапанаваноўваецца іншы падыход да работы над памылкамі. Кожны вучань працуе больш актыўна, усвядомлена. Ён знаходзіць сваю памылку, суадносіць з пэўным правілам, пацвярджае знойдзенымі прыкладамі. Карэкцыйная карта «*ВУЧУ СЯбе*» дапамагае вырашаць такія задачы, як фарміраванне ўстойлівай матывацыі да прадмета, крытычнага мыслення і крэатыўнасці навучэнцаў; павышэнне інтэнсіўнасці і забеспячэнне гібкасці навучальнага працэсу; развіццё навыкаў як самастойнай, так і каманднай працы.

**Resume.** The authors suggest a different approach to working on bugs. Each student works more actively, consciously. He finds his mistake, correlates with a certain rule, confirms the found examples. The “TEACH YOURSELF” correction card helps to solve such tasks as the formation of sustainable motivation for the subject, critical thinking and creativity of students; increase the intensity and flexibility of the learning process; developing skills in both independent and teamwork.

**Ключавыя словы:** карэкцыйная карта, табліца, правілы, прыклады.

**Key words:** correction map, table, rules, examples.

Як зрабіць так, каб у вучнёўскіх сшытках было б менш памылак? Звычайна работа над памылкамі праводзіцца па наступнай схеме: вучням неабходна прааналізаваць моўную з’яву, успомніць адпаведнае правіла, самастойна падабраць прыклады на гэтае правіла.

Але калі ісці такім шляхам і тлумачыць кожную памылку на дошцы, то эфектыўнасці, на наш погляд, будзе мала. Як паказвае практыка, вучні цікавяцца сваімі памылкамі, а памылкі, якіх няма ў іх работах, проста ігнаруюць. Бывае, на жаль, што работа над памылкамі зводзіцца да спісвання з дошкі запісаў настаўніка.

Слушныя парады дае А.У.Казлова ў дапаможніку для настаўнікаў «Карэкцыйная работа на ўроках беларускай мовы» [1]. Аўтар раіць выкарыстоўваць аптымальны, на яе думку, варыянт эфектыўнай сістэмы карэкцыйнай работы па беларускай мове, арыентаванай на дыферэнцыяцыю навучання, на павышэнне ўзроўню пісьменнасці вучняў. А.У.Казлова прапаноўвае карэкцыйныя лісты, варыянты карэкцыйных набораў для карэкцыі і сістэматызацыі вучэбнага матэрыялу, карэкцыйныя карты для правядзення работы над памылкамі пасля напісання дыктанта. Такім чынам, у кнізе раскрываецца сістэма карэкцыйнай работы.

**Карэкцыйныя карты для правядзення работы над памылкамі пасля напісання дыктанта**. Прааналізаваўшы прапанаваныя варыянты, мы паспрабавалі стварыць свае карэкцыйныя карты «ВУЧУ СЯбе» як варыянт работы над памылкамі пасля кантрольных работ. Такая карта складаецца з трох табліц. У першай табліцы ў 12-16 графах змешчаны тлумачэнні правіл (яны сфармуляваны на мове вучняў!), на якія вучні зрабілі памылкі ў дыктанце. У другой табліцы будзе столькі ж графаў, як і ў першай табліцы, толькі ў іх будуць размешчаны прыклады да прапанаваных правіл. Графы першай і другой табліц не супадаюць. Напрыклад, правілу з графы Б першай табліцы адпавядае прыклад з графы 8 другой табліцы. Такім чынам, кожны будзе працаваць больш актыўна, усвядомлена. Вучань знаходзіць сваю памылку, суадносіць з пэўным правілам, пацвярджае знойдзенымі прыкладамі.

У трэцюю табліцу **«ВУЧУ СЯбе»** запісвае ў адпаведныя графы словы, спалучэнні слоў або сказы, у якіх  дапусціў памылкі, правільна)

Такая работа дапамагае вучням паўтарыць асноўныя правілы, слоўнікавыя словы; зрокавая памяць фіксуе правільныя варыянты напісання.

Настаўніку трэба ўлічваць, што ў вучняў розная колькасць памылак. Таму трэба прадумаць самастойную работу ці па вывучэнні нескладанай новай тэмы, ці па выкананні заданняў павышанай цяжкасці па вывучанай тэме. Нашым вучням вельмі падабаецца быць кансультантамі па выкананні работы над памылкамі, а таксама ствараць ментальныя карты па новых тэмах.

Карэкцыйная карта «ВУЧУ СЯбе» ствараецца па выніках канкрэтнага напісанага дыктанта (пераказу) у канкрэтным класе. Прапануем карэкцыйную карту «ВУЧУ СЯбе» па выніках кантрольнага дыктанта «Гімн жыццю» ў 6 класе. Дыктоўка праводзілася пасля вывучэння тэмы «Назоўнік».

**Алгарытм работы:**

1) Работа па табліцах «Правілы» (табл. 1) і «Прыклады» (табл. 2).

Заданне: суаднесці правілы і прыклады: А – 15, Б – 9 і г.д. і запісаць у сшытак;

2) Работа з тэкстам.

Заданне: прачытаць тэкст, вызначыць тэму і асноўную думку, знайсці прыклады на адпаведныя правілы (гл.табліцу 1);

3) Запаўненне табліцы «ВУЧУ СЯбе» (табл.3).

Заданне: запісаць правільна словы, спалучэнні слоў або сказы, у якіх дапушчаны памылкі, у адпаведныя графы.

Усе вучні класа працуюць у адпаведнасці з 1 і 2 пунктамі алгарытму. А вось пасля тыя, у каго не было памылак, або дапамагаюць аднакласнікам, якія для просьбы аб дапамозе выкарыстоўваюць сігнальныя карткі, або ствараюць ментальную карту па новай тэме.

Табліца 1. «Правілы»

| | | | |
|---|---|---|---|
| **А.)** Перад **што, дзе, які, як, каб, калі**… ставіцца коска. Звычайна гэта **складаны сказ**, які мае больш за адну граматычную аснову | **Б.) Ж, Ш, ДЖ,Ч, Р,Ц**– зацвярдзелыя і таму не могуць спалучацца з літарамі **я, е, і, ё, ю** | **В.)** Калі вымаўляецца гук **падоўжана,** пішацца **2 літары**: **(*галосны* + *[З’][Л’]о[С’][Н’]ыя [ДЗ’]е[Ц’]і; [Ж][Ш]*+ *галосны= зз, лл, сс, нн, ддз, цц, жж, шш*).** У астатніх выпадках пішацца **1 літара** | **Г.)** Трэба адрозніваць **прыстаўку** ад **прыназоўніка** (***прыстаўка*** + слова = разам ***прыназоўнік*** + слова = асобна) |
| **Д.) Е, Ё→ Я** *ў першым складзе перад націскам* | **Е.) Няма** такіх спалучэнняў літар ~~**ті, те, тя.**~~ Пішам **ці, це, ця!** (*пры змякчэнні* **Т→Ц**) | **Ё.)** Прыставак ~~**ра-**~~ і ~~**ат-**~~ няма! Ёсць прыстаўкі **ад-** *(пішацца нязменна)* і **рас-** *(калі корань слова пачынаецца з глухога зычнага)* або **раз-** *(калі корань слова пачынаецца са звонкага зычнага)* | **Ж.)** Трэба запомніць напісанне некаторых слоў!!! |
| **З.)** У канцы дзеясл.пр.ч. адзіночнага ліку мужчынскага роду пішам суфікс **-ў-** ( не ~~-л-~~) | **І.) Няма** такіх спалучэнняў літар ~~**ді, де, дя.**~~ Пішам **дзі, дзе, дзя!** (*пры змякчэнні* **Д→ДЗ**) | **К.) Звонкія** перад глухімі і на канцы слова ***аглушаюцца***, а **глухія** перад звонкімі ***азванчаюцца***. | **Л.)** Пасля ***галосных*** **У→ Ў** |
| **М.)** Літары ~~**Щ**~~ у бел. мове не існуе: **Щ→ *ШЧ*** | **Н.)** Паміж **аднароднымі членамі** сказа ставіцца **коска**, калі пры іх *няма злучнікаў* | **О.)** Калі паміж **аднароднымі членамі** сказа *ёсць адзіночны злучнік* **і**, то ***коска НЕ ставіцца*** | |

Заданне: Суаднясіце правілы з прыкладамі

Табліца 2. «Прыклады»

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** Расшчабятацца, рассыпаць, раздумаць, адкінуць, адкрыць. | **2.** Весяліцца – вясёлы, лётчык – ляцець | **3.** Хвіліна ўсхваляваных успамінаў. Працаваў па-ўдарнаму. Гяздуюцца ў нас. З'явіўся ў Мінску. | **4.** Пясчаны – пясок, чародка – чароды, на ўзмежку – узмежак (мяжа), грыб – грыбы; касьба – касіць, малацьба – малаціць |
| **5.** Стагоддзе, узбярэжжа, галлё, калоссе, жыццё | **6.** Стаяць на зямлі Беларусі помнікі, абеліскі, мемарыяльныя ансамблі. | **7.** Цень, цецярук, паляцелі, цікава, бываюць. | **8.** Гаварыў, пісаў, запамінаў, быў, ліў |
| **9.** Жэлацін, сакратар, шэдэўр, цырымонія, почырк, канцылярыя | **10.** На сене – насенне, па лесе – Палессе | **11.** Пошчак, усхваленне, скрыпучы, шматгалосы | **12.** На Курган Славы зямлю прывозілі з гарадоў-герояў і з памятных мясцін нашай краіны. |
| **13.** Шчодры, шчака, шчупак | **14.** Дзяцел, дзень, на заводзе, дзівосы | **15.** Цяпер перад вачыма гэтых немаладых людзей усплываюць падзеі, што ўчэпіста трымае памяць. | |

2) **Работа з тэкстам**

- прачытайце тэкст;
- вызначыце тэму і асноўную думку;
- знайдзіце прыклады на адпаведныя правілы (гл.табліцу 1).

4) **Запаўненне табліцы «ВУЧУ СЯбе»**

Заданне: запішыце ў адпаведныя графы словы, спалучэнні слоў або сказы, у якіх вы дапусцілі памылкі, правільна.

Табліца 3. «ВУЧУ СЯбе»

| | | | |
|---|---|---|---|
| А) | Б) | В) | Г) |
| Д) | Е) | Ё) | Ж) |
| З) | І) | К) | Л) |
| М) | Н) | О) | |

Карэкцыйная карта «*ВУЧУ СЯбе*» дапамагае вырашаць такія задачы, як фарміраванне ўстойлівай матывацыі да прадмета, крытычнага мыслення і крэатыўнасці навучэнцаў; садзейнічае павышэннчю інтэнсіўнасці і забеспячэнню гібкасці навучальнага працэсу, развіццю навыкаў як самастойнай, так і каманднай працы.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Казлова, А. У. Карэкцыйная работа на ўроках белаускай мовы : дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі / А. У. Казлова. – Мазыр : Выснова, 2019. – 76 с.